Весці БДПУ. Серыя 1. 2016. № 4. С. 40–43.

ПСІХАЛОГІЯ

УДК 159.923

ДАСЛЕДАВАННЕ ПСІХАЛАГІЧНАГА ЗМЕСТУ ВОБРАЗА БУДУЧЫНІ Ў ЮНАЦКІМ УЗРОСЦЕ

Н. С. Данілава,
выкладчык кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі БДПУ

Паступіў у рэдакцыю 02.11.16.

UDC 159.923

A STUDY OF THE PSYCHOLOGICAL CONTENT OF THE IMAGE OF THE FUTURE IN ADOLESCENCE

N. Danilava,
Teacher of the Department of Social and Family Psychology, BSPU

Received on 02.11.16.

Артыкул прысвечаны вывучэнню псіхалагічнага зместу вобраза будучыні ў юнакоў і дзяўчат з розным сацыяльным статусам. Навуковая навізна даследавання заключаецца ў пашырэнні і паглыбленні навуковых ведаў аб псіхалагічным феномене «вобраз будучыні»; тэарэтычна распрацаваны, пацверджаны эмпірычна і апісаны кампаненты вобраза будучага.
У асноўнай частцы апісаны метадычны комплекс, які дазваляе вывучыць змястоўныя кампаненты вобраза будучыні ў юнацкім узросце. Прыводзяцца вынікі фактарнага аналізу дыягнастычных дадзеных, які дазволіў выдзеліць змястоўныя кампаненты вобраза будучыні: каштоўнасна-сэнсавы, мэтавы, эмацыйна-ацэначны, арганізацыйны, тэмпаральны. Прадстаўлена мадэль змястоўнай арганізацыі вобраза будучыні ў юнацкім узросце.

Ключавыя словы: вобраз будучыні, юнацкі узрост, змястоўныя кампаненты, фактарны аналіз, абагульнены фактар.

The article is devoted to the study of the psychological content of the image of the future of boys and girls with different social status. Research novelty lies in the fact that expanded and deepened scientific knowledge about the psychological phenomenon of «the way of the future»; theoretically developed, empirically validated and described substantial components of the image of the future.
In the introduction of a concept «vision of the future; selected and described meaningful components of the image of the future.
In the main part of the described materials, which allows to study a substantial component of the image of the future in adolescence. The results of factor analysis of diagnostic data, allowing to allocate substantial components of the image of the future: value-semantic, task, emotional-evaluative, organizational, temporal. Presents a model of meaningful organization vision of the future in adolescence.
In the final part of the article concludes that the empirical study has enabled to confirm and supplement the theoretically developed model.
The results of the study can be used in various areas of youth work as a basis for the development of socio-psychological support of boys and girls, when carrying out psychological trainings, assistance in the development of optimal models of the future.

Keywords: the image of the future, adolescence, substantial components, factor analysis, generalized factors.

Уводзіны. Праблемы, звязаныя з уяўленнямі асобы пра ўласную будучыню, планаваннем будучыні, уплывам уяўленняў пра будучыню на арганізацыю жыццёвага шляху ў цяперашні час досыць інтэнсіўна распрацоўваюцца айчыннымі і замежнымі псіхолагамі. Даследаванні, якія праводзяцца навукоўцамі і стаяць на розных тэарэтычных пазіцыях, прывялі да з'яўлення значнай колькасці паняццяў для апісання ўяўленняў асобы пра ўласную будучыню. Рознымі даследчыкамі выкарыстоўваліся паняцці «часовая перспектыва» (К. Левін, Ж. Нюттен, Т. Коттл і інш.), «жыццёвая перспектыва» (К. А. Абульханова-Слаўская, Е. І. Галаваха), «часовы кругагляд» (П. Фресс), «жыццёвы сцэнарый» (Э. Берн) «арыентацыя на будучыню» (Т. Гісме), «асабістая будучыня» (З. Залескі) і г. д. Дадзеныя паняцці маюць розныя ўзроўні абагульнення, уключаюць змястоўныя аспекты, адрозніваюцца структурнай арганізацыяй, многія з іх не да канца аперацыяналізаваны.

У якасці аднаго з варыянтаў вырашэння дадзенай праблемы можа быць прапанаваны канструкт «вобраз будучыні», які ўвайшоў у навуку дзякуючы працам Г. Бэйтсана [1] і К. Прыбрама [2]. Аналіз навуковай літаратуры дазваляе сцвярджаць, што вобраз будучага

Репозиторий БГПУ

ёсць рэпрэзентацыя ў свядомасці чалавека тых аб'ектаў, якія адсутнічаюць у сітуацыі актуальнага ўзаемадзеяння чалавека са светам. Дадзены канструкт прадугледжвае прызнанне актыўнасці суб'екта ў канструяванні ўласнай будучыні і ўключэнне свядомасці ў плоскасць актыўнасці асобы. На здольнасць чалавека свядома мысленна прадбачыць будучыню паказвала К. А. Абульханава-Слаўская [3], К. К. Платонаў вызначаў перспектыву, як вобраз жаданага, усведамлённага і магчымага свайго будучага жыцця [4], Е. І. Галаваха пісаў аб цэласнай карціне будучага [5]. І. А. Ральнікава паказвала, што выбар тэрміна «вобраз» для аперацыяналізацыі ўяўленняў чалавека пра ўласную будучыню дазваляе ўлічыць такія параметры, як цэласнасць і прыналежнасць да вобласці ўяўленняў [6].

Тэарэтычны аналіз дазваляе зрабіць выснову, што вобраз будучага з'яўляецца складаным утварэннем, якое інтэгруе розныя часовыя каардынаты і працэсы; ён функцыянуе ў ролі эталона, структуруючы стымулы і забяспечваючы адбор неабходнай інфармацыі. Ён арыентуе жыццядзейнасць суб'екта ў маштабах шматгадовай часовай перспектывы і галоўных каштоўнасцяў, вызначае накіраванасць развіцця ў будучыні і асабісты сэнс перажыванняў у сучаснасці. Вобраз будучага з'яўляецца псіхалагічным феноменам, які інтэгруе ўяўленні суб'екта пра ўласную будучыню, актуалізуе утрыманне асабістага вопыту, кіруе псіхічнай актыўнасцю ў сучаснасці, мадэлюе варыянты будучыні і дэтэрмінуе агульную накіраванасць жыццёвага шляху асобы. Вобраз будучыні з'яўляецца вынікам унутранай працы асобы, накіраванай на стварэнне бесперапыннай уласнай жыццёвай гісторыі, якая дазваляе забяспечыць жаданае асабістае развіццё і аптымальнае функцыянаванне ў соцыуме. Патрэба ў фарміраванні вобраза будучыні выступае ў якасці адной з асноўных патрэб юнацкага ўзросту, што абумоўлена аб'ектыўнымі абставінамі і логікай асабістага і сацыяльнага развіцця.

У многіх навуковых даследаваннях, прысвечаных праблематыцы вобраза будучыні, закранаюцца пытанні, якія тычацца змястоўных кампанентаў вобраза будучыні, аднак варта адзначыць, што ў прасторы сучаснай псіхалагічнай навукі няма адзінага меркавання адносна гэтай праблемы. Аналіз навуковай літаратуры па праблеме даследавання дазволіў выявіць наступныя змястоўныя кампаненты вобраза будучыні: каштоўнасна-сэнсавы, эмацыйна-ацэначны, арганізацыйны, мэтавы, тэмпаральны. Каштоўнасна-сэнсавы кампанент вылучае значныя для асобы каштоўнасці і сэнсы, якія вызначаюць напрамкі развіцця. Пабудова вобраза будучыні мае на мэце асэнсаванне падзей і матываў, усвядамленне жыццёвых перспектыў, змястоўную напоўненасць будучага, рэалістычнасць планаў на будучыню, ацэнку ўзроўню цяжкасці мэт і планаў [7; 8].

Эмацыйна-ацэначны кампанент разглядаецца ў даследаваннях айчынных і замежных аўтараў, як вынік чакання пазітыўных, нейтральных або негатыўных падзей у будучыні і ўключае эмоцыі, пачуцці, якія ўзнікаюць у сувязі са змястоўным напаўненнем ладу будучага жыцця [9; 10].

Арганізацыйны кампанент вобраза будучыні ўяўляе сабой сукупнасць міжасобасных адносін, самаадносінаў, якія абумоўліваюць формы і стратэгіі паводзін, актыўнасць асобы, а таксама дазваляюць увасобіць у жыццё запланаваныя падзеі [11]. Тэмпаральны кампанент адлюстроўвае часовую працягласць вобраза будучыні, насычанасць на падзеі будучыні і часовую лакалізацыю чаканых падзей [12]. Мэтавы кампанент уключае патрэбы асобы і шляхі іх задавальнення [13; 14].

Асноўная частка. Мэтай дадзенага даследавання з'яўлялася выяўленне змястоўных кампанентаў вобраза будучыні ў юнацкім узросце. У якасці выбаркі даследавання выступалі юнакі і дзяўчаты ва ўзросце 18–19 гадоў: навучэнцы 2–3 курса Мінскага фінансава-эканамічнага каледжа, студэнты 2 курса факультэта псіхалогіі БДПУ, студэнты 2 курса энергетычнага факультэта БНТУ і прадстаўнікі працоўнай моладзі. Усяго ў даследаванні прыняло ўдзел 326 чалавек.

Дыягнастычны комплекс, які дазваляе выявіць змястоўныя кампаненты вобраза будучыні быў сфармаваны на падставе тэарэтычнага даследавання і ўключаў: тэст Д. А. Лявонцьева «СЖО», методыку Х. Ніэмі «Жыццёвыя каштоўнасці», методыку МВС Р. С. Панцялеева, методыку дыягностыкі міжасобасных адносін Т. Ліры, методыку Е. Ю. Каржова «Псіхалагічная біяграфія», методыку Ф. Зімбарда ZTPI, «Шкалу суб'ектыўнага дабрабыту» адаптаваную М. В. Сакаловай, батарэю методык М. Р. Гінзбурга «Метады даследавання псіхалагічнай будучыні».

У даследаванні для вызначэння змястоўных кампанентаў вобраза будучыні выкарыстоўваўся фактарны аналіз для атрымання дадзеных, усебаковы разгляд якіх дазволіў вылучыць шэсць абагульненых узаемазвязаных фактараў.

Першы абагульнены фактар, названы «Асэнсаванне жыцця», складаюць шкалы, якія характарызуюць узровень асэнсаванасці ўсяго жыццёвага шляху. Найбольшую нагрузку ў дадзеным фактары нясуць каштоўнасная насычанасць (r = 0,65), накіраванасць у цяперашні час (r = 0,61), локуса кантролю Я (r = 0,60), локуса кантролю – жыццё (r = 0,60), накіраванасць

Рэпазіторый БДПУ

у мінулае (r = 0,60), асэнсаванасць жыцця (r = 0,59), самакаштоўнасць (r = 0,53), цікавасць да будучыні (r = 0,52), надзея ў адносінах да будучыні. Дадзены фактар мае агульную вагу фактарных нагрузак r = 10,52, што дазваляе казаць пра вядучую ролю сэнсажыццёвай рэфлексіі ў фарміраванні вобраза будучыні.

Другі абагульнены фактар, пазначаны як «Самаадносіны», уключае ў сябе паказчыкі самаадносін і адносін да будучыні. Найбольшую нагрузку маюць наступныя паказчыкі: унутраная канфліктнасць (r = -0,54), трывога ў адносінах да будучыні (r = -0,54), падпарадкаванасць (r = -0,48), самаабвінавачанні (r = -0,48), паказчык асэнсаванасці жыцця (r = 0,48), локуса кантролю – жыццё (r = 0,44), суб'ектыўны дабрабыт (r = -0,54).

Трэці абагульнены фактар, названы «Жыццёвыя падзеі», уключае параметры, якія характарызуюць падзейную насычанасць жыццёвага шляху і самастаўлення, і змяшчае наступныя шкалы: агульная колькасць жыццёвых падзей (r = -0,67), колькасць жыццёвых падзей будучыні (r = -0,62), колькасць жыццёвых падзей мінулага (r = -0,54), самаабвінавачанні (r = 0,51), антыцыпатыю (r = -0,46), самакіраванне (r = 0,45), унутраную сумленнасць (r = 0, 43).

Чацвёрты абагульнены фактар пазначаны як «Міжасабовыя адносіны» і ўключае наступныя шкалы: эгаізм (r = 57), агрэсіўнасць (r = 56), залежнасць (r = 52), падазронасць (r = 46), аўтарытарнасць (r = 45), прыязнасць (r = 46).

Пяты абагульнены фактар уключае шкалы, якія характарызуюць уменне і жаданне рэспандэнтаў планаваць падзеі ўласнага жыцця. Фактар пазначаны як «Планаванне» і ўключае наступныя параметры: планаванне будучыні на бліжэйшыя 10 гадоў (r = -0,49), планаванне будучага на бліжэйшыя 20 гадоў (r = -0,49), планаванне будучага на бліжэйшыя 3 гады (r = -0,41), планаванне будучага на бліжэйшыя 5 гадоў (r = -0,40) і прыналежнасць да пэўнай групы (r = -0,40).

Шосты абагульнены фактар пазначаны як «каштоўнасці» і мае агульную вагу фактарнай нагрузкі r = 2,67. Дадзены фактар уключае наступныя параметры: матэрыяльныя каштоўнасці (r = 44), каштоўнасць сацыяльнага статусу (r = 43), эгаізм (r = 39), альтруізм (r = -36), прыязнасць (r = -35), незалежнасць (r = 35).

Такім чынам, фактарны аналіз агульнагрупавой матрыцы даследнай выбаркі дазваляе зрабіць выснову, што вобраз будучыні ў юнацкім узросце ўключае шэсць асноўных кампанентаў: «Асэнсаванне жыцця», «Самастаўленне», «Жыццёвыя падзеі», «Міжасобасныя адносіны», «Планаванне», «Каштоўнасці». У рэспандэнтаў прысутнічае жаданне знайсці сэнс жыцця і вызначыць свае мэты. Эмацыянальныя адносіны да будучыні характарызуюцца цікавасцю і надзеяй. Суб'ектыўны дабрабыт рэспандэнтаў звязаны з адсутнасцю ўнутраных канфліктаў, адмоўных эмоцый у адносінах да сябе, трывогі ў адносінах да будучыні, упэўненасцю ў тым, што кантроль над жыццём магчымы. Рэспандэнты задумваюцца аб часовай працягласці сваёй будучыні, але, разам з тым, у іх адсутнічае жаданне разважаць над канкрэтнымі жыццёвымі падзеямі мінулага і будучыні, адсутнічае жаданне дэталёва планаваць будучыню. У міжасобасных зносінах рэспандэнты выкарыстоўваюць розныя тыпы адносін да навакольных людзей: ад агрэсіўнасці да прыязнасці. Дастаткова высокі ўзровень інтэрнальнасці спрыяе ўпэўненасці ў тым, што незалежна ад знешніх падзей, сітуацый і арыенціраў яны змогуць ажыццявіць свой выбар і пабудаваць будучыню ў адпаведнасці са сваімі жаданнямі.

Заключэнне. Вынікі фактарнага аналізу агульнагрупавой матрыцы даследнай выбаркі дазваляюць зрабіць выснову, што вобраз будучыні ў юнацкім узросце ўключае шэсць асноўных змястоўных кампанентаў. Каштоўнасна-сэнсавы кампанент, прадстаўлены фактарамі «асэнсавання жыцця» і «Каштоўнасці», з'яўляецца сукупнасцю каштоўнасных і сэнсавых утварэнняў, якія вызначаюць асаблівасці працэсу фарміравання і змястоўнага напаўнення вобраза будучыні. Арганізацыйны кампанент, прадстаўлены фактарамі «Самастаўленне» і «Міжасабовыя адносіны», уключае сукупнасць міжасобасных адносін, самаадносіны, якія абумоўліваюць формы і стратэгіі паводзін, актыўнасць асобы, якія дазваляюць увасобіць планы ў жыццё. Мэтавы кампанент, прадстаўлены фактарам «Планаванне», уключае ў сябе рашэнні суб'екта адносна меркаваных вынікаў дзейнасці (мэты, жыццёвыя планы, жыццёвыя праграмы). Тэмпаральны кампанент, прадстаўлены фактарам «Жыццёвыя падзеі», адлюстроўвае часовую лакалізацыю чаканых падзей, падзейную насычанасць і часовую працягласць будучыні. Эмацыйна-ацэначны кампанент прадстаўлены ў фактарах «Асэнсаванне жыцця» і «Самастаўленне» і адлюстроўвае пачуцці, эмоцыі, якія ўзнікаюць у сувязі з планаваннем і прагназаваннем будучых падзей. Змястоўныя кампаненты вобраза будучыні ўтвараюць стратэгічны патэнцыял асобы, які вызначае магчымасць пабудовы паспяховага і рэалістычнага вобраза будучыні ў канкрэтных сацыяльных умовах. Змястоўныя кампаненты вобраза будучыні прадстаўлены на рысунку.

Вынікі фактарнага аналізу пацвярджаюць тэарэтычна распрацаваную мадэль. Аналіз атрыманых дадзеных дазваляе зрабіць наступную выснову: вобраз будучыні ў юнацкім

Рэпазіторый БДПУ

узросце фарміруецца на падставе сэнсажыццёвай рэфлексіі і сістэмы каштоўнасцяў асобы ў працэсе ўзаемаадносін з іншымі і самастаўлення праз планаванне канчатковых вынікаў, у якасці якіх выступаюць канкрэтныя падзеі жыццёвага шляху.

Рысунак. – Змястоўныя кампаненты вобраза будучыні

Літаратура

1. *Бэйтсан, Г.* Экалогія розуму (Выбраныя артыкулы па антрапалогіі, псіхіятрыі і эпістэмалогіі) / Г. Бейтсан. – М. : Сэнс, 2000. – 480 с.
2. *Прыбрам, К.* Мовы мозгу. Эксперыментальныя парадоксы і прынцыпы нейрапсіхалогіі / К. Прыбрам // Цэнтр гуманнасці. [Электронны рэсурс]. – 1975. – Рэжым доступу: http://gtmarket.ru/. – Дата доступу: 10.02.11.
3. *Абульханава, К. А.* Час асобы і час жыцця / К. А. Абульханава, Т. Н. Бярэзіна. – СПб. : Алтея, 2001. – 304 с.
4. *Платонаў, К. К.* Структура і развіццё асобы / К. К. Платонаў. – М. : Навука, 1986. – 255 с.
5. *Галаваха, Е. І.* Жыццёвая перспектыва і каштоўнасныя арыентацыі асобы. Псіхалогія асобы ў працах айчынных псіхолагаў / Е. І. Галаваха. – СПб. : Пітэр, 2010. – 172 с.
6. *Ральнікава, І. А.* Жыццёвыя перспектывы асобы ў навуковай парадыгме псіхалагічных ведаў / І. А. Ральнікава // Весці Алтайск. дзярж. ун-ту. – 2011. – № 2. – С. 53–60.
7. *Чудноўскі, В. Э.* Праблема станаўлення сэнсажыццёвага арыентацый асобы / В. Э. Чудноўскі // Псіхалаг. журн. – 2004. – Т. 25, № 6. – С. 5–11.
8. *Граноўская, Р. М.* Элементы практычнай псіхалогіі / Р. М. Граноўская. – СПб. : Гаворка, 2007. – 396 с.
9. *Гінзбург, М. Р.* Псіхалогія асабістага самавызначэння : дыс. ... д-ра псіхал. навук : 19.00.13 / М. Р. Гінзбург. – М., 1996. – 247 л.
10. *Грыгароўская, Н. Ю.* Асаблівасці усьвядомленай і неўсвядомленага кампанентаў асобаснай арганізацыі часу : дыс. ... канд. псіхал. навук. : 19.00.01 / Н. Ю. Грыгароўская. – М., 1999. – 167 л.
11. *Галавей, Л. А.* Псіхалогія станаўлення суб'екта дзейнасці ў перыяды юнацтва і дарослaсці : дыс. ... д-ра псіхал. навук : 19.00.01 / Л. А. Галавей. – СПб., 1996. – 526 с.
12. *Галаваха, Е. І.* Псіхалагічны час асобы / Е. І. Головаха, А. А. Кронік. – М. : Сэнс, 2008. – 272 с.
13. *Абульханава-Слаўская, К. А.* Жыццёвыя перспектывы асобы / К. А. Абульханава-Слаўская // Псіхалогія асобы і лад жыцця : зб. арт. / Рос. акад. навук, Ін-т псіхалогіі ; рэд. Е. В. Шорохова [і інш.]. – М., 1987. – С. 137–145.
14. *Сагава, З. А.* Мэтавыя арыентацыі ў жыццёвых планах студэнтаў ВНУ : дыс. ... канд. псіхал. навук : 19.00.07 / З. А. Сагава. – Стаўрапаль, 2004. – 156 л.

References

1. *Beytsan, G.* Ekalogiya rozumu (Vybranyya artykuly pa antrapalogii, psikhiyatryi i epistemalogii) / G. Beytsan. – M. : Sens, 2000. – 480 s.
2. *Prybram, K.* Movy mozgu. Eksperymentalnyya paradoksy i pryntsypy neyrapsikhalogii / K. Prybram // Tsentr gumannastsi. tekhnolag. [Elektronny resurs]. – 1975. – Rezhym dostupu: http://gtmarket.ru/. – Data dostupu: 10.02.11.
3. *Abulkhanava, K. A.* Chas asoby i chas zhyttsya / K. A. Abulkhanava, T. N. Byarezina. – SPb. : Alteya, 2001. – 304 s.
4. *Platonau, K. K.* Struktura i razvittsyo asoby / K. K. Platonau. – M. : Navuka, 1986. – 255 s.
5. *Galavakha, Ye. I.* Zhyttsyovaya perspektyva i kashtounasnyya aryyentatsyi asoby. Psikhalogiya asoby u pratsakh aychynnykh psikholagau / Ye. I. Galavakha. – SPb. : Piter, 2010. – 172 s.
6. *Ralnikava, I. A.* Zhyttsyovyya perspektyvy asoby u navukovay paradygme psikhalagichnykh vedau / I. A. Ralnikava // Vestsi Altaysk. dzyarzh. un-tu. – 2011. – № 2. – S. 53–60.
7. *Chudnouski, V. E.* Prablema stanaulennya sensazhyttsyovay aryyentatsyi asoby / V. E. Chudnouski // Psikhalag. zhurn. – 2004. – T. 25, № 6. – S. 5–11.
8. *Granouskaya, R. M.* Elementy praktychnay psikhalogii / R. M. Granouskaya. – SPb. : Gavorka, 2007. – 396 s.
9. *Ginzburg, M. R.* PSikhalogiya asabistaga samavyznachennya : dys. … d-ra psikhal. navuk : 19.00.13 / M. R. Ginzburg. – M., 1996. – 247 l.
10. *Grygarouskaya, N. Yu.* Asablivastsi usvyadomlenaga i neusvyadomlenaga kampanentau asobasnay arganizatsyi chasu : dys. … kand. psikhal. navuk : 19.00.01 / N. Yu. Grygarouskaya. – M., 1999. – 167 l.
11. *Galavey, L. A.* Psikhalogiya stanaulennya subyekta dzeynasti u peryyady yunatstva i daroslastsi : dys. … d-ra psikhal. navuk : 19.00.01 / L. A. Galavey. – SPb., 1996. – 526 s.
12. *Galavakha, Ye. I.* Psikhalagichny chas asoby / Ye. I. Galavakha, A. A. Kronik. – M. : Sens, 2008. – 272 s.
13. *Abulkhanava-Slauskaya, K. A.* Zhyttsyovyya perspektyvy asoby / K. A. Abulkhanava-Slauskaya // Psikhalogiya asoby i lad zhyttsya : zb. art. / Ras. akad. navuk, In-t psikhalogii ; red. Ye. V. Shorakhava [i insh.]. – M., 1987. – S. 137-145.
14. *Sagava, Z. A.* Metavyya aryyentatsyi u zhyttsyovykh planakh studentau VNU : dys. … kand. psikhal. navuk : 19.00.07 / Z. A. Sagava. – Staurapal, 2004. – 156 l.

Рэпазіторый ВДПУ